# З вопыту рэалізацыі праекта «ШАГ» - «Школа актыўнага грамадзяніна» у дзяржаўнай установе адукацыі «Люсінская сярэдняя школа імя Якуба Коласа» Ганцавіцкага раёна

**Тэма:** "Радзіма мая Беларусь у асобах. Абаронцы Айчыны" (аб супрацоўніках узброеных Сіл, пагранічнай службы, мытнай службы, МНС)

**Мэта:** выхаванне будучых абаронцаў краіны, адказных перад сваёй сям'ёй, грамадствам, дзяржавай.

**Удзельнікі:** вучні 8-11 классов ДУА "Люсінская сярэдняя школа імя Якуба Коласа"

22 лютага 2024 года ў ДУА "Люсінская сярэдняя школа імя Якуба Коласа" ў рамках інфармацыйна-адукацыйнага праекта «Школа актыўнага грамадзяніна» прайшла інфармацыйная гадзіна на тэму "Радзіма мая Беларусь у асобах. Абаронцы Айчыны" (аб супрацоўніках узброеных Сіл, пагранічнай службы, мытнай службы, МНС).



У ходзе першага этапу "Мы даведваемся", пад час віктарыны, вучні актуалізавалі свае веды і назвалі памятныя даты, на якія багаты месяц люты. Заключным святам лютага стане Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Разважаючы над пытаннем, чаму патрэбна ваенная служба, вучні прыйшлі да выніку , што абарона краіны – гэта святы грамадзянскі доўг. Зусім новай для вучняў стала інфармацыя аб існаванні міжнародных армейскіх гульняў, з вялікай цікавасцю дзеці глядзелі відэаролік аб спаборніцтвах. Таксама у ходзе віктарыны, вучні ўспомнілі знакамітых лётчыкаў: Карвата Уладзіміра Мікалаевіча, Нічыпорчыка Андрэя Уладзіміравіча і Куканенка Мікіту Барысавіча, якія цаной свайго асабістага жыцця выратавалі людзей.Справядліва, што за свій гераізм пілотам было прысвоена званне "Герой Беларусі". Вучні і настаўнікі ўшаннавалі памяць герояў хвілінай маўчання.



На занятак быў запрошаны ганаровы госць – начальнік крымінальнага вышуку Ганцавіцкага РАУС Юрчык Дзмітрый Іванавіч. Дзмітрый Іванавіч падрабязна расказаў аб сваім прафесійным станаўленні. Пасля заканчэння вучобы ў школе ён спрабаваў свае сілы ў школе міліцыі, аднак вырашыў, што пакуль не пройдзе тэрміновую службу ў арміі, шлях міліцыянера не пачне. “Выбар арміі – добры шлях для многіх хлопцаў”, – адзначыў Дзмітрый Іванавіч. Пасля арміі ён сконыў, на той час яшчэ Магілёускі каледж МУС і Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт і атрымаў юрыдычную адукацыю, пасля чаго прыступіў працаваць на пасадзе старэйшага ўпаўнаважанага групы па наркакантролю Баранавіцкага РАУС, а затым быў пераведзены ў Ганцавіцкі РАУС.

Дзмітрый Іванавіч падзяліўся небяспечнымі падзеямі, з якімі прыходзілася сутыкацца пад час прафесійнай дзейнасці: “Калі выратоўваеш чужое жыццё – за сваё не страшна”. Але таксама ён адзначыў, што кожны супрацоўнік павінен быць не толькі добра фізічна развіты, але і мець навык камунікатыўнага ўзаемадзеяння. За сваю працоўную дзейнасць Дзмітрый Іванавіч быў узнагароджаны нагрудным знакам “За адданасць службе ” і медалём “100 год міліцыі Беларусі”.




У канцы сустрэчы вучні і настаўнікі школы павіншавалі Дзмітрыя Іванавіча з надыходзячым святам і падзякавалі за цікавую сустрэчу.

*Курылік А.А., намеснік дырэктара па па асноўнай дзейнасці*
*ДУА «Люсінская сярэдняя школа імя Якуба Коласа»*